Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

21 ЧЭРВЕНЯ 2019 г.
ПЯТНІЦА
№ 115 (28982)

9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ +TV ПРАГРАМА

## СПАРТЫЎНАЙ УДАЧЫ І ГУЧНЫХ ПЕРАМОГ!

*Членам дэлегацыі Рэспублікі Беларусь на ІІ Еўрапейскіх гульнях 2019 года ў г. Мінску*

*Дарагія сябры!*

Гісторыя алімпійскага руху ў нашай краіне даўняя і слаўная. Мы ганарымся беларускімі атлетамі, чые імёны і трыумфы назаўсёды ўпісаны ў пераможны летапіс айчыннага і сусветнага спорту. Захапляемся іх мужнасцю, сілай духу і воляй да перамогі.

Быць дастойнымі пераемнікамі куміраў папярэдніх пакаленняў — значыць паказаць на ІІ Еўрапейскіх гульнях максімум сваіх магчымасцяў і найлепшы вынік. Яркімі выступленнямі і неаспрэчнымі рэкордамі чарговы раз узняць краіну на п'едэстал спорту высокіх дасягненняў.

Перакананы, што нацэленасць на поспех, майстэрства, прафесійныя амбіцыі трэнераў і спартсменаў прывядуць нашу каманду да новых алімпійскіх вяршыняў. Энергія роднай зямлі прыдасць на гэтым шляху сілы, а падтрымка балельшчыкаў настроіць на бескампрамісную і захапляльную барацьбу за медалі.

Веру ў вас, жадаю моцнага здароўя, спартыўнай удачы і гучных перамог на славу нашай Беларусі!

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь,
Прэзідэнт Нацыянальнага алімпійскага камітэта Рэспублікі Беларусь
Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

# Яркі год — яркі ты!

## Сёння ў Мінску адкрываюцца ІІ Еўрапейскія гульні




Фота БелТА.

# Пляцоўка адпачынку з настроем

## У Мінску каля Палаца спорту ўжо адкрылася галоўная фан-зона, сёння такія пляцоўкі з'явяцца каля «Мінск-Арэны» і «Чыжоўка-Арэны»

**Сталічныя фан-зоны гатовыя прымаць гасцей штодня з 10.00 да поўначы, а ў дні адкрыцця і закрыцця Гульняў фан-зона каля Палаца спорту будзе працаваць да 4 раніцы.**

Адкрыццё галоўнай зоны актыўнасці балельшчыкаў Еўрапейскіх гульняў ператварылася ў маштабнае шоу: на вялікай сцэне каля сталічнага Палаца спорту выступілі Прэзідэнцкі аркестр Беларусі пад кіраўніцтвам Віктара Бабарыкіна і зоркі беларускай эстрады. *«Мы два гады ішлі да таго, каб сказаць, што Мінск гатовы да правядзення ІІ Еўрапейскіх гульняў, прыёму ўдзельнікаў, а таксама да таго, каб падарыць чарговае свята,* — адзначыў на адкрыцці галоўнай фан-зоны **намеснік старшыні Мінгарвыканкама Арцём ЦУРАН.** — *Мы хочам не толькі паказаць нашу абноўленую сталіцу, але і пазнаёміць замежных гасцей з лагоднасцю, ветлівасцю і гасціннасцю мінчан».*

Побач са сцэнай размясціліся дзясяткі міні-зон з рознымі гульнямі. Хтосьці «рубіўся» ў петанк, нехта гуляў у мініфутбол з акулярамі віртуальнай рэальнасці або ў «Джэнга», шашкі і іншыя настольныя гульні.

СТАР. 3

Камунальныя стасункі

# Калі домаўладанне — сумеснае

## Завочнае галасаванне і электроннае апытанне

**Для шматкватэрных жылых дамоў застаюцца два спосабы кіравання — з дапамогай самаарганізацыі (стварэння таварыства ўласнікаў або жыллёва-будаўнічага кааператыва) і праз упаўнаважаную асобу — дзяржаўнага заказчыка. Дык вось, парадак прыняцця рашэнняў у сумесных домаўладаннях, у першую чаргу ў таварыствах уласнікаў, зменіцца. Гэта прадугледжана новай рэдакцыяй Жыллёвага кодэкса, якая была прынята сёлета ў пачатку мая, а ўступіць у сілу з 1 студзеня наступнага года. Як адзначыў начальнік упраўлення жыллёвай гаспадаркі Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі Андрэй РАМАШКА ў прэс-цэнтры БелТА, прынцыповай навізной гэтага дакумента з'яўляецца сістэматызацыя шэрагу прававых актаў, якія былі прыняты ў сферы жыллёвых адносін.**

СТАР. 2

## КОРАТКА

- Чэкі «Маёмасць» з 1 ліпеня можна будзе абмяняць на акцыі яшчэ 25-і ААТ.
- **У мінскім аэрапорце 10 000 замежнікаў пачастуюць васількавым марозівам.**
- Жыхары амерыканскага штата Вірджынія 18 чэрвеня заўважылі ў небе над возерам Сміт Маўнцін рэдкую прыродную з'яву — хвалепадобныя аблокі.



- **«Беларуснафта» да Еўрапейскіх гульняў пабудавала ў Мінску 50 электразарадных станцый.**

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА *Да чытача з любоўю!*

**Ідзе падпіска на «Звязду» на ІІІ квартал і ІІ паўгоддзе**

**Мы абяцаем цікавае лета з любімай газетай**

**ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ – НЕ ПАШКАДУЕЦЕ!**